**П. Панамарэнка**

**Сакратар ЦК КП(б)Б**

# Сталінская праграма далейшага ўздыму калгаснага земляробства Беларусі

Пастанова Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей» спаткана беларускім народам з вялікай радасцю. Гэтай гістарычнай пастановаю забяспечваецца далейшы ўздым калгаснага земляробства ў Беларусі, адкрываецца новы перыяд у развіцці прадукцыйных сіл рэспублікі.

Пастановаю вызначана грандыёзная праграма работ: «У мэтах далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі Беларускай ССР, усебаковага развіцця грамадскай гаспадаркі калгасаў і павелічэння даходаў калгаснікаў, асушыць і асвоіць у бліжэйшыя пятнаццаць год 4 мільёны гектараў балот і забалочаных зямель у басейнах рэк Заходняй Дзвіны, Дняпра, Сожа, Нёмана і Прыпяці, уключаючы і Пінскія балоты».

Збываецца векавая мара беларускага народа. Воляю партыі бальшэвікоў, совецкага ўрада, вялікага друга працоўных таварыша Сталіна беларускія балоты, якія з'яўляліся ў мінулым крыніцай нішчаты, хвароб, бездарожжа і бескультур'я, у бліжэйшы час ператворацца ў квітнеючыя палі і лугі—крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

Беларускія балоты размешчаны пераважна ў Палескай нізіне, займаючай цалкам тэрыторыі Палескай і Пінскай абласцей, палавіну Брэсцкай, паўднёвыя часткі Мінскай і Баранавіцкай абласцей, паўднёва-заходнюю частку Магілеўскай вобласці і заходнюю частку Гомельскай. Па Палескай нізіне цячэ працяжэннем звыш 800 кілометраў рака Прыпяць. У басейне гэтай ракі налічваецца 416 рэк і рэчак агульным працяжэннем у 12.864 кілометры. Сваімі веснавымі водамі Прыпяць затапляе да 400 тысяч гектараў зямель, прычым шырыня разліву дасягае месцамі 23 кілометраў.

Палескія балоты маюць многавяковую гісторыю. На сотні кілометраў цягнулася аднастайная і сумная карціна: топкія балоты, пакрытыя нізкарослым хвойным лесам, зараслямі кустарніка. На ўзвышаных месцах размясціліся дрымучыя лясы.

Беспрасветным было жыццё беларускіх сялян, асабліва ў Палессі, пры царскім самадзяржаўі і пад ігам польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Балоты былі адвечным бічом беларускага селяніна. Яны выматвалі з яго ўсю душу. Народны паэт Беларусі Янка Купала ў выдатнай

паэме «Над ракой Арэсай» з гранічнай яснасцю вялікага мастака даў карціну цяжкага, бязрадаснага, жабрацкага жыцця селяніна-палешука.

Між топкіх багнішчаў,
На выдмах пясчаных,
Як на папялішчы,
Рад хат, бы курганаў.
Жывуць людзі ў хатах,
Плятуць сабе лапці,
Каб з торбай у латах
Пайсці жабраваці.
Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў,
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосна.
Іх розум балота
Трымае палонна,—
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.
Легенды і казкі
Прыгонных законаў
Паўзуць мохам вязкім,
Багуннем вялёным.
Праз леты і зімы
Паданне йшло ў векі:
— Палешукі мы,
А не чалавекі!

Між тым, у гэтых страшных балотах таіліся велізарныя, вякамі нарастаўшыя багацці: за многія стагоддзі тарфянікі балот накапілі каласальную колькасць азота і фосфара.

Але аб скарыстанні гэтых багаццяў беларускі селянін мог толькі марыць.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя прынесла беларускаму народу разняволенне ад векавога гнёту. Расцвіла эканоміка, расцвіла і культура беларускага народа. У БССР зараз налічваецца 10.258 калгасаў, яднаючых 783 тысячы сялянскіх гаспадарак. З года ў год расце механізацыя асноўных сельскагаспадарчых работ у калгасах. На калгасных палях Беларусі працуюць звыш 9.000 трактараў, каля 1.500 камбайнаў, дзесяткі тысяч малатарань, сеялак, ільноцерабілак і іншых машын; 98 процантаў усёй пасеўнай плошчы калгасаў абслугоўваецца 338 машына-трактарнымі станцыямі.

За апошнія годы ў Беларусі праведзен рад мерапрыемстваў, адыграўшых велізарную ролю ў далейшым умацаванні калгасаў. Ссяленнем 191 тысячы хутарскіх гаспадарак у калгасныя пасёлкі ліквідавана адна з вялікіх перашкод для далейшага развіцця соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Наводзіцца строгі парадак у калгасным землекарыстанні, у калгасах уводзяцца правільныя севаабароты.

Для далейшага быстрага развіцця соцыялістычнай сельскай гаспадаркі Беларусі асушэнне і асваенне балот і забалочаных зямель маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне. З першых-жа дзён савецкай улады беларускія сяляне ў розных месцах адваёўвалі кавалкі зямлі ў балот. Але гэтыя асобныя спробы не маглі, вядома, прывесці да вырашэння такой велізарнай задачы, як асушэнне мільёнаў гекта-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

раў балот і забалочаных зямель. Вырашэнне гэтай задачы стала магчымым толькі цяпер, ва ўмовах соцыялістычнага землеробства, ва ўмовах грамадскай гаспадаркі калгасаў, узмацнеўшых і арганізацыйна, і эканамічна.

У рэзультаце ініцыятывы, праяўленай калгасамі і калгаснікамі, у мінулым годзе былі асушаны дзесяткі тысяч гектараў балот. У меліярацыйных работах тады ўдзельнічалі 3.325 калгасаў, 63.300 калгаснікаў. Было асушана 68.000 гектараў балотных зямель, паднята цаліны 41.000 гектараў, пракладзена магістральных каналаў 479 кілометраў, палепшан сток павярхоўных вод з пахаці, лугоў і пасбішч на плошчы ў 78.000 гектараў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы